*Аляксандр Коласаў*

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАБОТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАСОЖЖА

У 2006 г. аўтарам артыкула праводзілася вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Магілёўскага Пасожжа (падстава — Дазвол па форме № 1, № 1684). На тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна разведкамі было даследавана каля 26 помнікаў археалогіі, сярод якіх 12 з'яўляюцца новымі, раней невядомымі ў навуковай літаратуры: стаянкі каменнага веку ля вв. Бакаў, Поліпень, Рагаліна, Юны Араты, паселішчы эпохі жалеза і сярэднявечча Поліпень, Рагаліна, Тур'е, Юны Араты, курганныя пахаванні каля вёсак Перамога, Тур'е і Чарнышын (два могільнікі).

На плошчы 60 кв. м была таксама даследавана стаянка Вусце-2, якая размешчана на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага старыцы р. Сож, за 1,2 км ад аднайменнай вёскі. Культурны пласт залягае на глыбіні 0,1—0,5 м у падзолістым і ілювіяльным гарызонтах глебы. У паўночна-усходняй і паўднёва-ўсходняй частках раскопу, у межах зачышчаных ям акруглых абрысаў і лінзападобнага профілю, назіралася два скапленні крамянёвых артэфактаў. Ямы вызначаліся запаўненнем цёмна-шэрага колеру і мелі памеры 0,45 х 0,50 х 0,37 м і 0,60 х 0,66 х 0,46 м суадносна.

У выніку раскопак атрымана калекцыя крамянёвага інвентару, якая налічвае 1740 адз., а таксама чатыры фрагменты ганчарнай керамікі і 13 адз. мелкіх абпаленых костак. Сярод знаходак пераважаюць прадукты расшчаплення крэменю, якія адлюстроўваюць усе стадыі яго апрацоўкі на паселішчы: ад падрыхтоўкі адна- двухпляцовачных нуклеусаў (31 адз.) да адыходаў вытворчасці і нарыхтовак — адшчэпаў (970 адз.) і пласцін (352 адз.). Прылады працы прадстаўлены скрабкамі (дамінуюць — 24 адз.), разцамі (12 адз.), вырабамі з выемкай (4 адз.), праколкай, сякерамі ( 2 адз.) і цяслом. Наканечнікі стрэл (2 адз.) зроблены на пласцінах, знятых з двухпляцовачных нуклеусаў. Чаранок аднаго наканечніка лістападобнай формы з брушка падпраўлены стромкай рэтушшу. Другі наканечнік мае выразны з боку спінкі чаранок у выглядзе шыпа. Такім чынам, атрыманы ў выніку раскопак крамянёвы комплекс стаянкі Вусце-2 адносіцца да мезалітычнага часу. Але адсутнасць прамых аналогій атрыманым матэрыялам у Пасожжы робіць да канца нявызначанай культурную прыналежнасць і дакладную храналогію гэтага помніка.

У Клімавіцкім раёне асноўны фронт работ праходзіў у міжрэччы Сажа і Асцёра. Паўторна былі даследаваны стаянкі Барысавічы, Рудня, Стары Дзедзін і Старыя Пранічкі. Сярод новых помнікаў з'яўляюцца стаянкі ля вв. Стары Дзедзін (тры пункты) і Рудня. На стаянке Стары Дзедзін-4 былі праведзены невялікія раскопкі (30 кв. м). Помнік размешчаны на левым беразе р. Асцёр, за 1,2 км на ўсход ад аднайменнай вёскі. У выніку раскопак (30 кв. м) устаноўлена, што культурныя рэшткі сустракаліся да глыбіні 0,45 м і былі ўключаны ў падзолісты гарызонт глебы і пясок светла-жоўтага колеру. Калекцыя знаходак (1262 адз.) прадстаўлена ў асноўным прадуктамі расшчаплення крэменю — нуклеусамі (11 адз.), адшчэпамі (620 адз.), пласцінамі (223 адз.) і мелкімі асколкамі, а таксама нешматлікімі прыладамі працы (47 адз.): скрабкамі (20 адз.), праколкамі (2 адз.), скрэблам, рэтушным разцом, вастрыём, скрабком-праколкай, пласцінкай з прытупленай спінкай, ромбападобным наканечнікам стралы, апрацаваным дзвюхбаковай плоскай рэтушшу, трапецыямі (2 адз.) і цяслападобнымі вырабамі (3 адз.). У цэлым, атрыманы комплекс знаходак можна датаваць познім неалітам—пачаткам бронзавага веку. Гэтаму не супярэчаць і нешматлікія абломкі ляпнога посуду, большасць якога ўпрыгожана адбіткамі грэбеня і ямак. Арнаментацыя аднаго з фрагментаў керамікі наразнымі лініямі характэрна для посуду сярэднедняпроўскай культуры эпохі бронзы.

У выніку археалагічных работ на тэрыторыі Чавускага раёна каля в. Пухнова знойдзена два курганных могільніка і праведзены раскопкі мезалітычнай стаянкі Дзедня на плошчы 120 кв. м. Помнік размешчаны на правым беразе р. Кашанка (левая прытока Проні), за 0,75 км на паўднёвы захад

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова




Мал. 1. Крамянёвыя знаходкі з раскопак стаянкі Дзедня, 2006 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад в. Дзедня. Культурныя рэшткі распаўсюджваліся на глыбіні 0,2—0,5 м і літалагічна былі звязаны з ілювіяльным гарызонтам.

Атрыманая ў выніку раскопак калекцыя знаходак (3554 адз.) сведчыць, што ўрочышча Гута, дзе размешчана стаянка, было заселена неаднаразова. Тут, акрамя мезалітычных знаходак, прадстаўленых у асноўным вырабамі з крэменю (3095 адз.), маюцца таксама матэрыялы тшцінецка-сосніцкай культуры эпохі бронзы (фрагменты ляпнога посуду, асобныя з якіх арнаментаваны пракрэсленымі лініямі — 33 адз.), ранняга жалезнага веку (фрагменты ляпной керамікі — 65 адз.) і эпохі сярэднявечча (абломкі ганчарнага посуду — 361 адз.).

Крамянёвая індустрыя мезалітычнай стаянкі Дзедня была заснавана на імпартнай высакаякаснай сыравіне — паўпразрыстым крэменю цёмна-шэрага колеру. Упершыню для помнікаў мезаліту Пасожжа колькасныя суадносіны пласцін (1148 адз.) і адшчэпаў (1165 адз.) роўныя, з невялікай перавагай апошніх. Тэхналогія расшчаплення была накіравана на адціканне пласцін правільнай ножападобнай формы, асноўная частка якіх выкарыстоўвалася для вытворчасці прыладаў працы (314 адз.) (мал. 1), перш за ўсё, разцоў на зломе нарыхтоўкі (дамінуюць сярод прыладаў — 40 адз.), пласцін-укладышаў (26 адз.), мікрапласцін з прытупленым краем (18 адз.), наканечнікаў стрэл (24 адз.). Астанія вырабы прадстаўлены скрабкамі (18 адз.), скоблямі (8 адз.), праколкамі (4 адз.) і вастрыём.

На плошчы помніка было вывучана таксама 23 аб'екта, якія адлюстроўваюць дастаткова шырокі культурна-храналагічны дыяпазон засялення ўрочышча. Частка з гэтых аб'ектаў прадстаўлена рэшткамі пахаванняў тшцінецка-сосніцкай культуры (2), слупоў (12), ачагоў (2) і гаспадарчых ям (3). Несумненую цікавасць выклікаюць рэшткі чатырох ям мезалітычнага часу, якія папярэдне разглядаюцца намі як жыллёвы комплекс. Ямы былі сустрэты на глыбіні 0,52—0,56 м. Тры з іх вывучаны часткова ўздоўж заходняй сценкі раскопу, і таму прадстаўленні аб памерах і формах гэтых ям можна будзе ўдакладніць наступнымі раскопкамі. Адзначым толькі тое, што на дне адной з гэтых ям былі зачышчаны рэшткі слупа, які быў нахілены адносна да мацярыка. Чацвёртая яма памерам 2,78 x 1,62 x 0,55 м мела авальныя абрысы і лінзападобны профіль. На яе дне, ва ўсходняй частцы, таксама прасочваліся рэшткі нахіленага слупа.

Вывучэнне стаянкі Дзедня паказала, што перад намі сезоннае паселішча, пакінутае насельніцтвам бутаўскай культуры Волга-Окскага міжрэчча, мігранты якога ў раннім мезаліце дасягнулі басейна р. Сож.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова